# Духоўная місія бібліятэк

**21 — 22 мая ў сталіцы пройдуць XV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры.**

Сярод арганізатараў Чытанняў — міністэрствы культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Беларускі экзархат Рускай Праваслаўнай Царквы і іншыя арганізацыі.

Па благаслаўленні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі ў рамках XV Міжнародных Кірыла-Мяфодзеўскіх чытанняў адбудзецца штогадовая канферэнцыя "Духоўнае адраджэнне грамадства і праваслаўная кніга". Яе цэнтральнай тэмай стане духоўна-асветніцкая місія бібліятэк. Сярод тэм выступленняў заяўлены ўзаемадзеянне публічных і царкоўных бібліятэк па духоўна-маральным выхаванні на праваслаўных традыцыях, духоўнасць і праблемы дзіцячага чытання, праваслаўныя традыцыі і нацыянальная культура, выяўленчае мастацтва і музыка ў духоўна-маральным выхаванні чытачоў.

Свае даклады прапануюць прадстаўнікі царкоўных і свецкіх бібліятэк усіх сістэм і ведамстваў, работнікі адукацыі і культуры. Яны падзеляцца вопытам, у тым ліку, і па фарміраванні фондаў адпаведнай літаратурай, а таксама па наладжванні аўтаматызаваных пошукавых сістэм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культура № 18 2 8 мая 2009
с. 3